КАНФЕРЭНЦЫЯ НОВАЯ БЕЛАРУСЬ 2025

Рэзалюцыя дэмакратычных сілаў Беларусі
да Канферэнцыі Новая Беларусь 2025

# Аб недапушчальнасці парушэння свабоды сумлення і веравызнання ў Беларусі

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычных сілаў Беларусі,

Рашуча асуджаем сістэматычныя парушэнні права на свабоду сумлення і веравызнання ў Беларусі, якія здзяйсняюцца рэжымам Лукашэнкі. Рэпрэсіі супраць рэлігійных арганізацыяў з'яўляюцца часткай шырокамаштабнай кампаніі па знішчэнні грамадзянскай супольнасці і падаўленні любых формаў альтэрнатыўнай грамадскай ідэнтычнасці.

Пачынаючы з 2020 года, улады мэтанакіравана знішчаюць незалежныя арганізацыі пад выглядам «барацьбы з экстрэмізмам» і «дэстабілізацыяй». Агулам за гэты час знішчаныя каля 2000 арганізацыяў грамадзянскай супольнасці. У 2021 годзе былі атакі на праваабаронцаў, у 2022 — на прафсаюзы, у 2023 — на палітычныя партыі. У 2024–2025 гадах рэпрэсіі перакінуліся на рэлігійныя супольнасці.

Прынятыя папраўкі ў Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» абавязалі ўсе канфесіі прайсці перарэгістрацыю да 5 чэрвеня 2025 года. У той жа час, згодна з Крымінальным кодэксам Беларусі (арт. 193-1) прадугледжаная крымінальная адказнасць за любую дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

***Вядомыя шматлікія факты пазбаўлення дзяржаўнай рэгістрацыі рэлігійных супольнасцяў розных канфесіяў на падставе гэтага рэпрэсіўнага заканадаўства. У выніку шэраг парафіяў і рэлігійных групаў апынуліся па-за межамі прававога поля і пад пагрозай крымінальнага пераследу.***

Адначасова мы адзначаем жорсткія рэпрэсіі супраць духоўных асобаў, якія не падпарадкоўваюцца прапагандзе рэжыму:

– у снежні 2024 года каталіцкі святар Генрых Акалатовіч быў асуджаны на 11 гадоў пазбаўлення волі за меркаваны шпіянаж на карысць Польшчы і Ватыкана;

– 17 кастрычніка 2022 года праваслаўны святар Сяргей Рэзановіч атрымаў 16 гадоў за нібыта «змову з мэтай захопу ўлады»;

– 30 красавіка 2025 года святар Анджэй Юхневіч быў асуджаны на 13 гадоў пазбаўлення волі — пасля некалькіх арыштаў і абвінавачванняў у экстрэмізме за публікацыю фота з нацыянальнай і ўкраінскай сімволікай.

Паводле звестак праваабаронцаў, з 2020 года рэпрэсіям падвергліся не менш за 74 святары ўсіх канфесіяў — каталіцкія, праваслаўныя і пратэстанцкія. Сярод формаў пераследу: арышты, штрафы, вобшукі, звальненні, забарона на служэнне і вымушаная эміграцыя.

Мы лічым, што такая палітыка — гэта не толькі парушэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародных дамоваў, але і замах на духоўную і культурную разнастайнасць беларускага грамадства.

Асабліва сімвалічнай з’явай з’яўляецца знішчэнне беларускамоўных набажэнстваў. У Мінску застаўся толькі адзін праваслаўны храм, дзе літургія адбываецца на беларускай мове. Гэта — паказальны акт дыскрымінацыі, накіраваны супраць нацыянальнай самасвядомасці.

***У гэтай сувязі мы патрабуем:***

– адмяніць рэпрэсіўныя папраўкі ў Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях»;

– адмяніць артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса, які крыміналізуе дзейнасць незарэгістраваных арганізацыяў, уключаючы рэлігійныя групы;

– вызваліць усіх духоўных асобаў, якія былі зняволеныя па палітычных матывах;

– вярнуць вернікам канфіскаваныя храмы, уключаючы Чырвоны касцёл у Мінску;

– спыніць уціск, цэнзуру і адміністрацыйны кантроль над рэлігійнымі супольнасцямі;

– аднавіць рэгістрацыю ўсіх рэлігійных арганізацыяў і супольнасцяў, якія былі пазбаўленыя яе па палітычных ці адміністрацыйна-надуманных прычынах, у тым ліку падчас перарэгістрацыі ў 2024–2025 гадах.

***Мы звяртаемся да міжнароднай супольнасці з заклікам:***

– неадкладна адрэагаваць на парушэнні свабоды веравызнання ў Беларусі;

– забяспечыць рэгулярны міжнародны маніторынг і дакументаванне парушэнняў;

– заклікаць Спецпрадстаўніка ЕС па пытаннях свабоды веравызнання да расследавання гэтых выпадкаў;

– прадастаўляць юрыдычную і тэхнічную падтрымку пераследаваным рэлігійным супольнасцям;

– спрыяць развіццю міжнароднай салідарнасці паміж канфесіямі і дапамозе тым, хто вымушаны пакінуць Беларусь;

– узмацняць супрацоўніцтва з міжнароднымі праваабарончымі структурамі і беларускім грамадствам для забеспячэння празрыстага і рэгулярнага маніторынгу сітуацыі.

***Мы пацвярджаем,*** што свабода сумлення — гэта не толькі права чалавека, але і непарушная падстава для міру, згоды і дэмакратыі.